***Юлія Кучвальская***

## ХРЫСЦІЯНСКІЯ МАТЫВЫ ПЕСЕНЬ ЗАХОДНЕПАЛЕСКАГА КАЛЯДНАГА АБРАДАВАГА ЦЫКЛА

*У артыкуле разглядаюцца асаблівасці матываў заходнепалескіх песень каляднага абрадавага цыкла, звязаных з хрысціянскай тэматыкай.*

***Julia Kuchvalskaya***

## CHRISTIAN MOTIVES IN THE SONGS OF WESTERN PALESSE KALYADY RITUAL CYCLE

*The article considers the features of the motives of western Palesse songs of the carol («kalyady») ritual cycle related to christian thematics.*

Важнай часткай традыцыйнай духоўнай культуры народа з’яўляецца абрадавы фальклор. Гэты феномен прыцягвае ўвагу многіх даследчыкаў. У сувязі з ростам рэлігійнасці ў гуманітарных навуках надзвычай актуальным з’яўляецца вывучэнне праяўлення сінкрэтызму вераванняў. Для фалькларыстыкі важнае значэнне мае даследаванне сінкрэтызму ўяўленняў у сувязі з абрадавым фальклорам. Асаблівую цікавасць прадстаўляе сінкрэтызм народных уяўленняў (элементаў традыцыйнай архаічнай рэлігійнасці) і хрысціянскай традыцыі. Так, В.М. Шарая адзначала, што важнай характарыстыкай этнакультурнага развіцця з’яўляецца сінкрэтычнасць народнай рэлігійнасці [7, с. 8]. На думку даследчыцы, «абрадавы каляндарны фальклор … утрымлівае элементы сінкрэтызму, непасрэдна звязаны з асаблівасцямі архаічнай рэлігійнасці, сістэмай архаічнай рэлігійнай сімволікі» [9, с. 8 – 9].

Працэс спалучэння дахрысціянскіх і хрысціянскіх традыцый вельмі складаны. М.І. Талстой, вывучаючы славянскія вераванні, адзначыў, што «в годичном календарном цикле сосуществует две системы духовного воззрения и мироощущения – христианская и языческая …» [4, с. 23].

Элементы сінкрэтычнага характару відавочна праяўляюцца ў песнях заходнепалескага каляднага абрадавага цыкла. Разгледзім матывы і сюжэтныя сітуацыі калядак і шчадровак, звязаныя з хрысціянскай тэматыкай.

Характэрная рыса заходнепалескай святочнай песеннай паэзіі –уключэнне ў тэксты пэўных хрысціянскіх вобразаў (Бога, Дзевы Марыі, святых і інш.). Хрысціянскія персанажы засвоены вуснай народнай традыцыяй, іх вобразы ў песеннай творчасці відазмяняюцца, надзяляюцца пэўнымі функцыямі.

На вербальным узроўні важнымі гасцямі з’яўляюцца Бог, апосталы Пётр і Павел, іх чакаюць гаспадары, для іх накрываюць стол. Напрыклад, у калядцы, запісанай на Выганаўскім Палессі, адлюстроўваецца наступная сітуацыя: гаспадар выходзіць на дарогу і запрашае «Господа» на вячэру: «...А на дорогу, // Господаръ ходить; // Къ собі Господа // На вечеру просить...» [6, с. 335 – 336]. У другім варыянце ў хаце гаспадара сядзяць «Самъ Господь» і апосталы Пётр і Павел, пры гэтым самае ганаровае месца займае Бог: «...Самъ Господь седить // Да на покутьи, // А Петро съ Павломъ // По застольейку, // А колядники – по заслонейку...» [1, с. 29].

У якасці вышэйшай істоты для селяніна выступае Бог, ён стваральнік Сусвету і чалавека, таму пануе над імі. У Бога прасілі дабрабыту, літасці, «Богъ Отецъ обладаетъ силою и властью; Онъ можетъ наказывать и миловать, но вместе съ темъ милосердъ, если обратиться к Нему съ молитвою или просьбою» [3, с. 421]. Гэта выразна адлюстравана ў наступнай калядцы, зафіксаванай намі на паўднёвым захадзе даследуемага рэгіёна: «...шо нам пан Бог дасть? // А нам пан Бог дав тры стожкі жыта, // Мы з того жыта напэчэм хліба» (в. Навалессе Маларыцкага р-на). У заходнепалескіх традыцыйных калядках да Бога звяртаюцца з просьбай аб лепшай долі, добрым ураджаі, здароўі, шчасці і наогул дабрабыце: «Дай ему, Боже, дай // Счастэ у полы, // Здоровэ у дому, // Дай ему, дай» [1, с. 30 – 32].

Значнае месца ў калядных песнях займаюць вобразы святых, якія згодна з песеннымі тэкстамі прымаюць удзел у палявых работах, родзяць жыта, павялічваюць колькасць пчол і інш. У калядцы, запісанай на Выганаўскім Палессі, па двары гаспадара ходзіць Бог і водзіць траіх святых: святога Юр’я, Пятра, Ілью. Кожны выконвае пэўную работу: «...Святый Юрэй землю одмыкае, // Святэе Петро жито зажинае, // А святая Лля скирты складае...» [2, с. 42].

Хрысціянскія матывы характэрныя і для заходнепалескіх шчадровак. Яны пераважна звязаны з вобразам Дзевы Марыі і святога Васіля. Так, у адной з заходнепалескіх шчадровак Божая Маці вядзе рой пчол: «...Хмара гудэ: // Пречиста идэ, // Пчолки вэдэ. // Щедры вечоръ, // Добры вечоръ. // Пчолки вэдэ, // Молодэнькія...» [1, с. 46]. Дадзеная сюжэтная сітуацыя спалучаецца з традыцыйнымі пажаданнямі. У другой шчадроўцы Божая Маці стаіць «при столу» і дзержыць «честный крестъ»: «...Пречиста Маты // Да веліла щедроваты, // При столу стояла, // Честный крестъ держала...» [1, с. 48].

Вобраз святога Васіля звычайна сустракаецца ў сюжэтных сітуацыях, якія адлюстроўваюць работу на гаспадарскім полі: «...Святэ Васылле по полю ходыть, // По полю ходыть, жытэчко родыть, // Жыто, пшыныцу, всяку пашныцу...» (в. Рухча 1 Столінскага р-на).

Хрысціянская традыцыя адлюстравалася не толькі ў песенных абыходных творах, але і ў тэрміналогіі абраду, яго ўдзельнікаў. Напрыклад, у дзіцячым абыходзе пад назвай «свéнтаты» ў в. Бялёва Камянецкага раёна напярэдадні Новага года: «...свéнтаты – мы спывáлі, свéнталі. А вжэ пуспывáймо і воны́ даю́т бліны́. Кáжды пек бліны́...». Вербальная частка абраду прадстаўлена падобнымі святочнымі песнямі: «Свента, свента Марыя, // На прыстолі стояла, // Богу свічу ставыла. // Молітыся люды, // Шо в той цэркввы будэ. // Богу свічу ставтэ, // А нам пырыг дайтэ!» (в. Бялёва Камянецкага р-на).

Шырокае распаўсюджванне на Заходнім Палессі атрымалі калядкі рэлігійнага зместу, якія адлюстроўваюць розныя біблейскія матывы. Значная частка рэлігійных калядных тэкстаў прадстаўлена сюжэтамі аб нараджэнні Ісуса Хрыста. У іх праслаўляецца нованароджаны Ісус Хрыстос, які часцей за ўсё выступае як цар, уладыка, збавіцель. У рэлігійных калядках падкрэсліваецца выратавальны сэнс нараджэння Божага Сына, значнасць гэтай падзеі для людзей: «Бог прэдвечный народілся, // Прышов днес со нібес, // Да спасті люд свой весь, // Утешылся. // В Віфлієме народілся, // Місея, Хрыстос наш, // Бог наш, для всех нас, // Нам народілся» (в. Азяты Жабінкаўскага р-на).

Сярод рэлігійных калядак вылучаецца група тэкстаў, у якіх змест евангельскіх эпізодаў разыходзіцца з кананічнымі апісаннямі. Гэтыя калядкі, грунтуючыся на кананічных і апакрыфічных сюжэтах, апісваюць падзеі, звязаныя з Ісусам Хрыстом: Яго нараджэннем, зямным жыццём. Народ хацеў быць удзельнікам гэтых вялікіх падзей, таму Хрыстос нараджаецца ў хлеве сялянскай сям’і, аб гэтым паведамляе «зора», якая над ім засвяціла: «...В ночы у північы, жынка пробудылась: // – Вставай чоловічы, якось та новына, // Шо над нашой шопой зора засвэтыла. // – Ой, то ны новына, то Прычыста Дева // Сына породыла...» (в. Вельямовічы Брэсцкага р-на).



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Сустракаецца ў гэтай групе заходнепалескіх калядак і матыў дзівоснага ўратавання Ісуса Хрыста і Дзевы Марыі ад ганіцеляў. Іх ратуе гаспадар, які працуе ў полі: «...І до господара прышла бож’я вража, // І вжэ Ірод той лукавы господару кажэ: // – Скажы, господарэ, нэ смій нам ілгаты, // Ой, ті шла тут коло тэбэ з дытыною маты? // – Ішла, ішла сюды, буйны вітэр віяв, // І тогда я в тое врэмя пшэнычэньку сіяв. // Став Ірод думаты, став назад вэртаты, // Ой, што давнэ тое було, нам йіх нэ догнаты...» [5, с. 87] і інш.

Меншае месца ў заходнепалескіх рэлігійных калядках займае тэма Хрыстовых мукаў, пры гэтым смерць і ўваскрасенне Ісуса Хрыста адсутнічаюць. Мукі Хрыстовы прадстаўлены сюжэтам аб распяцці Хрыста. Варта адзначыць, што тэксты, зафіксаваныя на Заходнім Палессі, маюць нekананічны характар, распавядаюць пра тое, як Божая Маці шукае свайго Сына, якога ўжо распінаюць: «...Твого сина жиди взяли, // На крижъ пъяли, // Ручки, ножки роспинали, // Ему муки задавали...» [6, с. 367].

Такім чынам, спецыфікай песень заходнепалескага каляднага абрадавага цыкла з’яўляецца іх сінкрэтычны характар. Хрысціянскія матывы, характэрныя для заходнепалескіх калядак «гаспадарскага» цыкла, у асноўным звязаны з вобразамі Бога, апосталаў Пятра і Паўла, святых Ільі, Юр’я. У шчадроўках найбольш распаўсюджаны вобразы Дзевы Марыі, святога Васіля. Хрысціянскія персанажы абрадавых тэкстаў успрымаюцца як апекуны галоўных сфер жыцця чалавека. Асаблівая роля ў лёсе сям’і, гаспадаркі ў святочных песнях належыць Богу, праз Яго выказваецца заклён на ўраджай, на здароўе, на шчаслівае жыццё сям’і і г.д. Рэлігійныя калядкі распрацоўваюць біблейскую тэматыку.

**Спіс літаратуры:**


1. Булгаковский, Д. Пинчуки: песни, загадки, пословицы, обряды, приметы, предрассудки, поверья, суеверия и местный словарь / Д. Булгаковский. – СПб. : Тип. В. Безобразова и К, 1890. – 200 с.
2. Довнар-Запольский, М. Песни пинчуков: с приложением карты северной части уезда и статьи о говоре / М. Довнар-Запольский. – Киев : Типография Императорского университета Св. Владимира В.И. Завадзкого, 1895. – 203 с.
3. Романов, Е. Материалы по этнографии Гродненской губернии : в 2 вып. / Е. Романов. – Вильна : Типография «Русский почин», 1911-1912. – Вып. 1. – 1911. – 237 с.
4. Толстой, Н. Славянские верования / Н. Толстой // Славянская мифология : энциклопед. словарь. – М., 1995. – С. 15–26.
5. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. / ідэя і агул. рэд. Т. Варфаламеевай. – Мінск : Вышэйшая школа, 2001-2013. – Т. 4. Брэсцкае Палессе : у 2 кн. / В. Басько [і інш.]. – 2008. – Кн. 1. – 559 с.
6. Чубинский, П. Труды этнографическо-статистической экспедиции в Западно-Русский край, снаряженной Императорским русским географическим обществом. Юго-Западный отдел. Материалы и исследования : в 7 т. / П. Чубинский. – СПб., 1872-1878. – Т. 3. Народный дневник. – 1872. – 486 с.
7. Шарая, В. Асаблівасці праяўлення сінкрэтызму ў вераваннях беларусаў : традыцыя і сучаснасць / В. Шарая // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі / Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі ; навук. рэд. А. Лакотка. – Мінск : Права і эканоміка, 2014. – Вып. 16. – С. 246–251.
8. Шарая, О. Синкретизм народной религиозности и особенности его изучения / О. Шарая // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы ; навук. рэд. А. Лакотка. – Мінск : Права і эканоміка, 2012. – Вып. 12. – С. 474–477.
9. Шарая, О. Ценностно-нормативная природа почитания предков / О. Шарая. – Минск : Тэхналогія, 2002. – 249 с.



***Чжан Цзинюй***


## ПРЕОБРАЗОВАНИЯ В КИТАЙСКОЙ НАРОДНОЙ КУЛЬТУРЕ ПЕРИОДА СИНЬХАЙСКОЙ РЕВОЛЮЦИИ


*В начале XX века в результате Синьхайской революции был уничтожен феодальный строй, господствовавший в Китае на протяжении более двух тысяч лет, что оказало огромное влияние на ход исторического развития страны. Под влиянием революционного движения многовековые китайские народные обычаи, стали претерпевать изменения. Они коснулись модернизации традиционных народных нравов, национальных костюмов, новогодних праздников и т.д.*



***Zhang Tszinyuy***


## TRANSFORMATION IN CHINESE FOLK CULTURE IN THE PERIOD OF XINHAI REVOLUTION


*The Revolution in the early 20th century has overthrew the feudal monarchy that ruled China for more than 2,000 years and exerted a tremendous influence on the development of Chinese history. Under the impact and influence of this movement, the Chinese folk customs that have passed down for thousands of years have also started to undergo a complete transformation. Chinese people have changed their costumes, living habits, as well as new cultures, and they have presented a number of modern elements.*


Синьхайская революция является наиболее известным переворотом в период новой истории Китая: в ее результате было свергнуто правление цинской династии, что положило конец режиму феодального самодержавия, существовавшему на протяжении двух тысячелетий, и была создана Китайская Республика. Кроме этого, великая победа революции принесла идеологическое освобождение. Синьхайская революция окончательно подорвала традиционный образ мышления старого общества, значительно повысила демократическое сознание народа, а также принесла целый ряд преобразований в области нравственных взглядов, народных обычаев общества и др. После создания Нанкинского временного правительства в стране стали прилагаться усилия для искоренения скверных феодальных привычек, пропагандировались новые веяния в обществе. В этот период изменения затронули все аспекты народных обычаев в Китае, однако наибольшие перемены коснулись стиля



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ